➤ У дзіцячым філіяле Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага прайшло адкрыццё тыдня дзіцячай кнігі "Каласок і Купалінка запрашаюць". На свята сабраліся малодшыя школьнікі, выхаванцы Панямунскага дзіцячага дома, настаўнікі, бацькі, пісьменнікі. У якасці пачэснага госця быў запрошаны паэт, намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Полымя" Уладзімір Мазго. З задавальненнем слухалі прысутныя выступленне земляка, яго вершы ў выкананні дзяцей, з удзячнасцю прынялі ад вядомага пісьменніка кнігі ў дар бібліятэцы. На свяце таксама былі ўзнагароджаны пераможцы конкурсаў на лепшы малюнак, водгук на кнігу і самыя актыўныя чытачы.

**Людміла КЕБІЧ**